# Школьная планета

***НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!***

***№ 4 (42) СНЕЖАНЬ 2017***

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці*




- ***Снежань зіму пачынае, а год канчае.***
- ***Снежань сцюжны з зімою дружны.***
- ***Снежань вока снегам цешыць, ды марозам вуха рве.***
- ***Сухі снежань – сухая вясна, сухое лета.***

*Першы месяц зімы і апошні каляндарнага года атрымаў назву **снежань** ад слова "снег". Старабеларускае найменне яго – **прасінец** (у значэнні "прасвет у воблаках"), старарускае – **студеный**. Рускі **декабрь**, англійскі **December** паходзіць ад лацінскага **december** (дзесяты – у старажытнарымскім календары). Здавён у гэтым месяцы асноўная праца сялян пераходзіла ў хату. Доўгімі зімовымі вечарамі гарэла лучына ў пасвеце ці на лучніку. Мужчыны займаліся дробным рамяством, рамонтам. Жанчыны ж пасля сядзення за грэбенем ці прасніцаю браліся ткаць кросны. Раней яны стаялі амаль у кожнай хаце.*



*Добра быў развіты прагноз надвор`я, стан будучай вясны вызначалі па зімовых прыкметах. Народныя веды замацоўваліся ў трапных прыказках і прымаўках. Снежань жыў чаканнем калядных свят.*

***Матэрыял падрыхтавала Паліна Сямашка***







ТВОЙ ПСІХОЛАГ

# *Пяцікласнікі… Асаблівасці ўзросту.*









***Пераход з малодшай школы ў сярэднюю — важны момант у жыцці школьніка.***

Перыяд адаптацыі ў 5-м класе з'яўляецца адным з цяжкіх перыядаў школьнага навучання. Гэта абумоўлена *сукупнасцю змен*, якія адбываюцца ў школьным асяроддзі:

- ✓ павелічэнне аб'ёму і разнастайнасць зместу адукацыі;
- ✓ пашырэнне кола настаўнікаў;
- ✓ на месца першай настаўніцы прыходзіць новы класны кіраўнік.

Стан дзяцей у гэты перыяд з педагагічнага пункту гледжання характарызуецца нізкай арганізаванасцю, вучэбнай безуважлівасцю і недысцыплінаванасцю; з псіхалагічнай — зніжэннем самаацэнкі, высокім узроўнем сітуатыўнай трывожнасці.

***Прыкметы паспяховай адаптацыі:***

- ✓ задаволенасць дзіцяці працэсам навучання;
- ✓ дзіця лёгка спраўляецца з праграмай;
- ✓ ступень самастойнасці дзіцяці пры выкананні заданняў, гатоўнасць звярнуцца за дапамогай да дарослага толькі ПАСЛЯ спроб выканаць заданне самому;
- ✓ задаволенасць асабістымі адносінамі як з аднакласнікамі так і з настаўнікамі.

***Прыкметы дэзадаптацыі:***

- ✓ стомлены знешні выгляд дзіцяці;
- ✓ нежаданне дзіцяці дзяліцца сваімі ўражаннямі аб праведзеным дні;
- ✓ негатыўныя характарыстыкі ў адрас школы, настаўнікаў, аднакласнікаў;
- ✓ неспакойны сон;
- ✓ пастаянныя скаргі на дрэннае самаадчуванне.

*Дом, у якім утульна ўсім!*

**berezino2.school.by vk.com/club59543714** ***№ 42, снежань 2017 г.***

**Прафарыентацыйная работа** ў школе, якая праводзіцца педагогамі і бацькамі, дапамагае кожнаму падлетку вызначыцца з выбарам будучай прафесіі да моманту заканчэння вучобы, прычым зрабіць гэта так, каб праз некалькі гадоў выпускніку не давялося шкадаваць аб прынятым рашэнні.



*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт*



*Беларуская сельска-гаспадарчая акадэмія*



*Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь*

***Старонку падрыхтавала Аляксандра Дудко***
***Фота Ірыны Маркевіч***

**Правілы дарожнага руху** трэба ведаць усім: і аўтамабілістам, і тым, хто рухаецца па вуліцах на веласіпедзе, і пешаходам. Няведанне або ігнараванне правілаў мае сумныя наступствы і часта заканчваецца аварыямі і траўмамі ўсіх удзельнікаў руху. Каб пазбегнуць непрыемнасцяў падобнага характару, бацькі і педагогі расказваюць дзецям, як правільна паводзіць сябе на праезнай частцы, тлумачаць правы і абавязкі.



*Прысвячэнне першакласнікаў у пешаходы*



*Прысвячэнне першакласнікаў у пешаходы*



*Прысвячэнне першакласнікаў у пешаходы*




*Толерантность. Что это такое? -*
*Если спросит кто-нибудь меня,*
*Я отвечу: "Это все земное.*
*То, на чём стоит Планета вся".*
*Толерантность - это люди света*
*Разных наций, веры и судьбы*
*Открывают что-то, где-то,*
*Радуются вместе. Нет нужды*
*Опасаться, что тебя обидят*
*Люди цвета, крови не твоей.*
*Опасаться, что тебя унизят*
*Люди на родной Земле твоей.*
*Ведь Планета наша дорогая*
*Любит всех нас: белых и цветных!*
*Будем жить, друг друга уважая!*
*Толерантность - слово для живых!*







***Определения толерантности:***

1.Сотрудничество, дух партнёрства.
2.Готовность мириться с чужим мнением.
3.Уважение человеческого достоинства.
4.Уважение прав других.
5.Принятие другого таким, какой он есть.
6.Способность поставить себя на место другого.
7.Уважение прав быть иным.
8.Признание многообразия.
9.Признание равенства других.
10 Терпимость к чужим мнениям, верованиям и поведению.
11.Отказ от доминирования, причинения вреда и насилия.




В 1992 году Генеральная Ассамблея ООН провозгласила **3 декабря** Международным днём инвалидов. Указом Президента Республики Беларусь в нашей стране этот день объявлен **Днём инвалидов Республики Беларусь.**

## 15 студзеня 2018 года спаўняецца 80 гадоў з дня ўтварэнняМінскай вобласці

### ГЕРБ І СЦЯГ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ



***Герб вобласці*** выкананы ў форме французскага шчыта, г.зн. прамавугольнік з суадносінамі бакоў 8 да 9 і завостраным выступам унізе. Ён мае паверхню колеру «яркага золата», якую па гарызанталі перасякаюць тры хвалістыя лініі блакітнага адцення. Справа ўверсе размешчаны герб сталіцы – горада Мінска. Завяршае кампазіцыю пяцізубцовая стылізаваная карона, таксама залатога колеру, выкананая ў выглядзе каменнай вежы. Па баках шчыта знаходзяцца дзве буйныя галіны з дубовымі лістамі, абвітымі сіняй элегантнай стужкай. Пад шчытом галінкі перакрыжаваны і звязаны паміж сабой фігурным бантам з той жа стужкі.

***Сцяг Мінскай вобласці — афіцыйны геральдычны сімвал Мінскай вобласці. Зацверджаны ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 лістапада 2007 года. Сцяг уяўляе сабой прамавугольнае палотнішча чырвонага колеру з суадносінамі бакоў 1:2, у цэнтры асабовага боку якога — выява герба Мінскай вобласці.***



***Гімн Мінскай вобласці Мінчына***

***музыка Алены Атрашкевіч словы Васіля Жуковіча***

*Край наш легендарны, ты непараўнаны,*
*Шчодры Нарачанскаю красой.*
*Веліччу сталіцы нашай гераічнай,*
*Дзіўнага Заслаўя даўнінай.*
*Міншчына - ты сэрца Беларусі,*
*У стагоддзях славу памнажай.*
*Будзь у шчасці і не будзь у скрусе,*
*Міншчына, наш мілы край.*
*Беражэм Купалы, Коласа Радзіму,*
*Запаведзь народных змагароў.*
*З намі светлы геній юнага Максіма,*
*Спадчына вялікіх «Песняроў».*
*Міншчына - ты сэрца Беларусі,*
*У стагоддзях славу памнажай.*
*Будзь у шчасці і не будзь у скрусе,*
*Міншчына, наш мілы край.*
*Прыгажэй, квітней ты з кожным новым маем,*
*Заставайся вечна маладой.*
*Родная старонка наша дарагая,*
*Ты наш лёс і песня і спакой.*
*Міншчына - ты сэрца Беларусі,*
*У стагоддзях славу памнажай.*
*Будзь у шчасці і не будзь у скрусе,*
*Міншчына, наш мілы край.*



# *ПРОБА ПЯРА*



***

*Повсюду рассыпая чудеса,*
*Играя роль весёлой чаровницы,*
*Бежит зима, царица-телеса,*
*Бежит зима на белой колеснице.*
*Мороз румянцем стынет на щеках -*
*Играется проказник, веселится!*
*Гуляет ветер где-то в облаках,*
*А рядом с ним – метели-баловницы.*
*Глядится вьюга в наледь на реках*
*И прячет робко синие зеницы,*
*Себя увидев в этих зеркалах.*
*Мне кажется, что это просто снится…*
*Но я стою средь белизны в мечтах,*
*Стараясь скрыть лихую озорницу –*
*Счастливую улыбку на губах…*
*Снежинки залепили мне ресницы,*
*Запутались в лохматых волосах;*
*Раздалась песня звонкая синицы.*
*Ещё хранится запах на руках –*
*То хвои, мандаринов, то корицы.*
*Ах, как приятно даже в мелочах*
*Встречать затейницы-зимы петлицы.*

*Лаптёнок Виктория, 9 «Б» класс*









# Дом, у якім утульна ўсім!

berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 42, снежань 2017 г.




**На пытанні адказвае Ігар Іванавіч Саскавец**



*Як і дзе вы бедзеце сустракаць Новы год?*

- Дома. З сям'ёй.

*Вы прыбіраеце елку?*

- Кожны год купляю жывую елку. Раней прыбіраў з дзецьмі, а зараз – з унучкай.

*Якія падарункі вы рыхтуеце?*

- Падарункі павінны быць недарагімі, але прыносіць шмат радасці.

*А які ваш самы жаданы навагодні падарунак?*

- Не хварэць на працягу ўсяго года.

*Вы верыце ў Дзеда Мароза?*

- У Дзеда Мароза трэба абавязкова верыць, бо часам бываюць і цуды.

**На пытанні адказвае Маркоўская Лізавета, 8 "Б" клас**



*Як і дзе ты бедзеш сустракаць Новы год?*

- Спачатку дома, а пасля з сябрамі.

*Вы прыбіраеце елку?*

- Так. І абавязкова ўсёй сям'ёй, бо гэта ўжо традыцыя.

*А які твой самы жаданы навагодні падарунак?*

- Падарунак не вельмі важны. Бо ў гэты дзень і без гэтага можна быць шчаслівай. Дастаткова знаходзіцца ў добрай і вясёлай кампаніі.

*Ты верыш у Дзеда Мароза?*

- Не. Цудаў не бывае.

**На пытанні адказвае Галіна Уладзіміраўна Баброўская**



*Вы верыце ў Дзеда Мароза?*

- Веру. Калі-нікалі бываюць цуды і Дзед Мароз прыносіць падарункі.

**На пытанні адказвае**
**Шмарлоўская Валерыя, 2 "А" клас**



*Ты прыбіраеш елку?*

- Так, бо хутка Новы год. А калі не будзе елкі, то і свята не будзе.

*Ты верыш у Дзеда Мароза?*

- Веру, бо кожны год ён прыносіць падарункі.

***Старонку падрыхтавалі Лізавета Маркоўская і Валерыя Усачова. Фота Ірыны Маркевіч***

# *Дом, у якім утульна ўсім!*

**berezino2.school.by   vk.com/club59543714   *№ 42, снежань  2017 г.***













ДУА "Сярэдняя школа № 2
горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц. Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына, Сямашка Паліна, Маркоўская Лізавета, Усачова Валерыя

